

Школьнікі 30 гадоў таму

СТАР. 5



Без дамоў-інтэрнатаў

СТАР. 5



Ці застануцца браты Запашныя ў Мінску жыць?

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ВЕРАСНЯ 2015 г. СЕРАДА № 167 (28025) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Афіцыйна

## ПРЭЗІДЭНТ ЗНАХОДЗІЦЦА З ВІЗІТАМ У КІТАІ

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Кітайскую Народную Рэспубліку, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Плануецца, што кіраўнік дзяржавы прыме ўдзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, прымеркаваных да 70-годдзя перамогі ў антыяпонскай вайне і заканчэння Другой сусветнай вайны. У ходзе візіту прадугледжаны таксама шэраг двухбаковых сустрэч Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніцтвам КНР.

■ Выбары-2015

## ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫЯ КАМІСІІ ПРАВЕРЫЛІ ПОДПІСЫ

**Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў размясціла на сваім сайце папярэднія звесткі аб колькасці выбаршчыкаў, што пакінулі свае подпісы за кожнага з прэтэндэнтаў на пост Прэзідэнта.**

Нагадаем, больш за сто тысяч подпісаў у тэрытарыяльныя камісіі перадалі ініцыятыўныя групы наступных прэтэндэнтаў: Аляксандра Лукашэнкі, Сяргея Гайдукевіча, Віктара Цярэшчанкі, Мікалая Улаховіча, Таццяны Караткевіч.

Пасля праверкі подпісаў тэрытарыяльныя камісіі ўстанавілі, што колькасць сапраўдных подпісаў у падтрымку дзейнага кіраўніка дзяржавы склала 1 753 380, у падтрымку Мікалая Улаховіча — 149 819, Сяргея Гайдукевіча — 139 877, Таццяны Караткевіч — 105 278. Вынікі праверкі паказалі, што за Віктара Цярэшчанку здадзена 6 699 сапраўдных подпісаў.

Наступным этапам выбарчай кампаніі стане рэгістрацыя кандыдатаў на пост кіраўніка дзяржавы. Як паведамлялася раней, ЦВК плануе правесці яе 10 верасня, а с 11 верасня пачнецца перыяд перадвыбарнай агітацыі і прапаганды.

Цяпер з 22 жніўня па 5 верасня ідзе падача ў Цэнтральную камісію дакументаў для рэгістрацыі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Віват, сувораўцы і курсанты!



Юны «навабранец» Ілья Круглоў, якога сёлета разам з іншымі залічылі ў Мінскае сувораўскае ваеннае вучылішча, разам са сваім бацькам Ігарам Уладзіміравічам.

Фота Надзеі БУЖАН.

**Сёлета выхаванцамі Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча сталі 70 чалавек. Звыш 700 грамадзян папоўнілі курсанцкія шэрагі краіны**

СТАР. 2

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі:**

*«Мы сёння бачым, што беларусы не абыякавыя да сваёй будучыні, да сваёй краіны, і таму назіраем актыўнасць, абмеркаванне. Але самае галоўнае, што мы забяспечваем права ўсіх, хто будзе зарэгістраваны кандыдатам у Прэзідэнты, на прадстаўленне сваёй праграмы, давядзенне сваёй пазіцыі да выбаршчыкаў, для таго каб грамадзяне Беларусі зрабілі свой свядомы выбар на карысць будучыні незалежнай Беларусі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.09.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17399,00 | ▼ |
| Еўра | 19661,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 266,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 802,72 | ▼ |

■ Прамая лінія

# Служба 101 заўсёды на сувязі

**За кошт чаго ўдалося рэзка знізіць колькасць загінулых на пажарах? Як беларускія ратаўнікі супрацоўнічаюць з украінскімі калегамі? Ці можна здаць у падраздзяленні МНС энергазберагальныя лямпы? У чым спецыфіка групы рызыкі ў розных краінах свету? На гэтыя і іншыя пытанні адказаў падчас «прамой лініі» міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.**




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Гэтым летам у Беларусь перакідвалася шмат лясных пажараў з Украіны. Растлумачце, калі ласка, як адбываецца супрацоўніцтва з тамтэйшымі падраздзяленнямі МНС? Усё-такі з-за ўзгаранняў, якія ўзнікаюць там, страты нясе беларускі лясны фонд...***

— Праблема пажараў, якія прыходзяць з Украіны да нас, існуе. Але будзем справядлівымі: з улікам шэрагу абставін на тым баку дзяржаўнай мяжы нельга сказаць, што там нічога не робяць. Разам з тым частыя перастаноўкі ў кіраўніцтве тамтэйшымі падраздзяленнямі МНС працу ўскладняюць істотна. У нас з украінцамі заключана адпаведнае пагадненне, падпісана шмат іншых дагавораў, перыядычна праводзяцца сумесныя вучэнні. Адны з іх, па тушэнні нафтагазавых фантанаў, прайшлі некалькі гадоў таму на такой базе, якой не было нават у нас. Сёлета ж украінскімі ратаўнікамі зноў кіруе новы чалавек. З першым намеснікам міністра мы ўжо гутарылі на тэму пажараў ля беларускай мяжы. Але папракнуць іх у бяздзейнасці мы не можам. Іншая справа, што, магчыма, няма такой эфектыўнасці, якой бы хацелася бачыць нам, — кожны ж працуе ў меру сваіх магчымасцяў і фінансавання. І катастрафічнага развіцця пажараў не дапускаюць. Сітуацыю ўскладняюць зоны, багатыя на дары лесу, і разам з тым цяжкапраходныя для спецыяльнай тэхнікі.

Падчас апошніх пажараў былі вымушаны задзейнічаць авіяцыю. І як толькі пачалася гэтая навала, мы напісалі лісты ў Брэсцкі і Гомельскі аблвыканкам з просьбай прапрацаваць пытанні ўзаемадзеяння з украінскімі памежнымі абласцямі. Патушылі на сумежных тэрыторыях 11 пажараў. Прыязджалі мы і ў Чарнігаўскую вобласць на тушэнне ўзгаранняў.

СТАР. 4

■ Смачна і бяспечна

# ШТО НА ТАЛЕРЦЫ Ў КЛІЕНТА?

## За якія парушэнні прыпыняецца праца аб'ектаў грамадскага харчавання

**Нядаўна сяброўка распавяла гісторыю пра тое, як прайшоў яе «рамантычны вечар» у рэстаране. Аня ў падрабязнасцях падзялілася тым, што ў гарбаце ёй папаўся чарвяк, узгадала, як гарачае падалі халодным, а афіцыянтка ўвесь час падганяла есці хутчэй, бо «яны зачыняюцца на спецабслугоўванне». Выслухаўшы яе, я задумалася над тым, а ці ведае хто-небудзь з кліентаў, што робіцца там, на кухні рэстаранаў і кавярняў? З якіх прадуктаў гатуюцца стравы? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнты «Звязды» знайшлі, выправіўшыся разам з супрацоўнікамі Міністэрства гандлю ў рэйд па аб'ектах грамадскага харчавання.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### ПРА ЗВАРОТЫ, ЧОРНЫ СПІС І ПОЎДЗЕНЬ

Да супрацоўнікаў гандлёвай інспекцыі мы з фотакарэспандэнтам далучаемся каля дванаццаці гадзін дня. Час выбраны не выпадкова. Менавіта апоўдні адчыняе свае дзверы сталічны рэстаран хуткага абслугоўвання «Byblos». Ён на той дзень і стаў аб'ектам праверкі. У Мінгандлі кажуць, што з ёй лепш прыходзіць менавіта пад адкрыццё: «Так можна знайсці больш недахопаў».

СТАР. 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### СМІ паведамілі аб з'яўленні расійскай авіяцыі ў Сірыі

У Сірыю прыбываюць расійскія самалёты, яны ўключацца ў паветраныя ўдары па сілах «Ісламскай дзяржавы». Паводле паведамленняў дыпламатычных крыніц, у найбліжэйшы час на авіябазе пад Дамаскам павінны быць разгорнутыя сілы ў некалькі тысяч расійскіх вайскоўцаў, якія прымуць удзел у барацьбе з баевікамі-ісламістамі.

### Краіны ЕС павінны падзяліць адказнасць у пытанні бежанцаў



Пра гэта заявіла канцлер ФРГ Ангела Меркель. «Сітуацыя нездавальняючая», — сказала яна. «Краіны-члены павінны падзяліць адказнасць. Калі ЕС пацерпіць крах у пытанні бежанцаў, то ў выніку ў нас будзе не тая Еўропа, якую мы ведаем», — падкрэсліла Меркель. У дачыненні да пратэстаў супраць прыёму бежанцаў яна сказала: «Не будзе талерантнасці ў дачыненні да тых, хто ставіць пад пытанне годнасць іншых людзей». Ангела Меркель заклікала грамадзян краіны не ўдзельнічаць у акцыях пратэсту супраць прыёму бежанцаў. Адначасова яна паведаміла, што ўлады ФРГ маюць намер прыняць шырокі пакет мер для вырашэння праблемы.

### Расійскія школьнікі будуць вучыць па дзве замежныя мовы

Другая замежная мова ўключана ў пералік абавязковых прадметаў школьнай адукацыі. Дзеці будуць вывучаць яе з 5-га па 9-ы клас. Школам даецца пераходны перыяд з улікам таго, што не ўсе рэгіёны пакуль да гэтага гатовыя, паведаміў кіраўнік Мінадукнавукі РФ Дзмітрый Ліванаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У Польшчы знойдзены цягнік з «золатам нацыстаў»?

Польскія ўлады былі вымушаныя заблакаваць доступ у зону на паўднёвым захадзе краіны, дзе, як мяркуецца, знаходзіцца цягнік з «золатам нацыстаў», пасля таго, як туды хлынулі паляўнічыя на скарбы, паведамляюць інфармагенцтвы.

Паводле некаторай інфармацыі, месца апошняй стаянкі нацысцкага цягніка знаходзіцца на ўчастку паміж 61-м і 65-м кіламетрамі чыгункі з Валбжыху ва Уроцлаў. Зону патрулюе паліцыя, а таксама гарадскія і чыгуначныя сілы аховы правапарадку. Нагадаем, на мінулым тыдні польскія ўлады паведамілі, што паказанні радара пацвердзілі знаходжанне бронецягніка пад зямлёй у ваколіцах горада Валбжых. Ён выяўлены менавіта ў тым месцы, пра якое і расказаў двум шукальнікам скарбаў перад смерцю мясцовы жыхар, які сцвярджаў, што дапамагаў схаваць цягнік.



КОРАТКА

**Фонд ААН у галіне народанасельніцтва і Упраўленне ААН па абслугоўванні праектаў прадаставіць Беларусі $3,7 млн на дасягненне нацпрыярытэтаў у сацыяльна-эканамічнай сферы.**

Знешні дзяржаўны доўг Беларусі па стане на 1 жніўня склаў $12,5 млрд і зменшыўся з пачатку года на $42,9 млн, або на 0,3% (з улікам курсавых розніц).

**Памер сярэдняўзважанай увазной мытнай пошліны ў Еўразійскім эканамічным саюзе з 1 верасня знізіцца да 5-5,3%. Істотным будзе зніжэнне пошлін на электрамашыны, электроніку, тэлепрыёмнікі, асвятляльныя тавары, сістэмы пералівання крыві і шэраг іншых таварных груп.**

Графіці-партрэт графа Чапскага з'явіцца на адной са сцен дома на вуліцы Кастрычніцкай у Мінску, паведамілі арганізатары другога беларуска-бразільскага street art-фестывалю Vulica Brasil, які праходзіць з 30 жніўня па 12 верасня.

■ Пакажы прыклад!

# ФОРМА ДЛЯ ВУЧНЯЎ І... ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Пілотны праект «Школа будучыні» ахопіць у новым навучальным годзе 725 школьнікаў з розных рэгіёнаў краіны. Ідэя яго аўтараў заключаецца ў тым, каб уніфікаваць адзенне дзелавога стылю для вучняў пачатковай школы і максімальна задзейнічаць пры гэтым патэнцыял айчынных прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці.**

**Па словах старшыні канцэрна «Беллегпрам» Мікалая ЯФІМЧЫКА,** гэта зусім не азначае, што ўсе дзеці будуць апранутыя аднолькава. «Нават у адной школе вучні розных класаў могуць выбіраць разам з бацькамі форму на свой густ. Галоўнае, што гэта будзе дзелавое адзенне, а выбар застанецца за навучальнымі ўстановамі. Напрыклад, у нас ёсць гімназіі, якія маюць свой твар і імідж, а з дапамогай адзення яны змогуць яго толькі дадаткова падкрэсліць», — патлумачыў ён.

Старшыня канцэрна запэўніў, што швейныя прадпрыемствы гатовы задаволіць любыя запыты вучняў, у тым ліку вышываць на вопратцы лагатыпы, эмблемы і фірменныя знакі школ.

СТАР. 3